**Капшуль, А.** Увекавечанне подзвігу воінаў-афганцаў. Новае скульптурнае рашэнне / А. Капшуль // Веснік Глыбоччыны. — 2002. — 9 верас. — С. 1, 4.

## УВЕКАВЕЧАННЕ ПОДЗВІГУ ВОІНАЎ-АФГАНЦАЎ. НОВАЕ СКУЛЬПТУРНАЕ РАШЭННЕ

У 1995 годзе раённы савет воінаў-інтэрнацыяналістаў выступіў з прапановай аб рэканструкцыі памятнага знака нашым землякам, якія загінулі пры выкананні воінскага абавязку ў Афганістане. Раённы выканаўчы камітэт падтрымаў ініцыятыву, і работа пачалася. Знайшлі выканаўцу праекта помніка, заключылі дамоўленасць з Мінскім мастацка-вытворчым камбінатам, актывізавалі работу па прыцягненню спонсарскіх ахвяраванняў. Значную матэрыяльную падтрымку аказала Полацкае прамыслова-камерцыйнае прадпрыемства «Спадарожнік», паступілі сродкі з раённага бюджэту, шэрагу прадпрыемстваў і арганізацый раёна. Як лічаць многія, праект адбыўся, – дзякуючы не толькі спонсарскай падтрымцы асобных кіраўнікоў раёна. Сярод іх называюць старшыню райвыканкама М. М. Кандзерскага, яго намеснікаў М. М. Маціеўскага, М. П. Чарапкоўскага, начальніка ўпраўлення капітальнага будаўніцтва І. С. Будзько, загадчыцу аддзела па справах моладзі В. І. Сямчонак, начальніка ПМК-49 В. П. Якубенка, былых старшыню райвыканкама В. І. Сініцкага, яго намесніка Т. Д.Саўліч.

Вялікую настойлівасць у гэтай справе праявіў і раённы савет воінаў-інтэрнацыяналістаў, якім на працягу многіх гадоў кіруе начальнік раённага аддзела Аб'яднання «Ахова» А. П. Ждановіч.

Такім чынам, дзякуючы агульным намаганням і стаpанню, у канцы жніўня гэтага года ў наш горад завіталі аўтар помніка беларускі скульптар Уладзімір Іванавіч Жбанаў і яго сааўтар Аляксандр Іванавіч Козел. З імі я сустрэлася на месцы работы – у парку Перамогі. Хоць дзень для гэтага выдаўся і не зусім спрыяльны, бясконца імжэў дождж, але ён не перашкодзіў скульптарам займацца сваёй справай. Узяўшы на некалькі хвілін перапанак, яны і паведалі аб сваіх творчых задумках.

– На месцы былога памятнага знака цяпер устанаўліваецца скульптура. Двухметровая фігура юнака са зброяй у руках сімвалізуе бясстрашнасць, гатоўнасць выканаць свой воінскі абавязак. Гэтыя пачуцці мне добра вядомыя, бо я сам прайшоў баявымі дарогамі Афганістана не адзін кіламетр, – расказваў аўтар. – Гэты помнік не толькі ўвекавечвае памяць загінуўшых. Ён тым, хто прайшоў баявымі дарогамі і ведае, што такое вайна.

Мой сааўтар Аляксандр Іванавіч выдатны скульптар па рабоце з камнем. І ўсё, што датычыцца афармлення помніка гэтым відам матэрыялу, – яго задумка. Няхай вам не здаецца, што сюды можна было б прывесці любы камень. Патрэбен быў такі матэыял, які мог бы падкрэсліць усю трагічнасць перажытага.

Скульптары падзяліліся яшчэ адной задумкай. Яна выспела ў іх за работай.

– Цяпер, калі мы ўжо бачылі вынік сваёй працы, можам прапанаваць дзеля поўнай яе завершаннасці невялічкі штрых – у цэнтр камянёў-валуноў просіцца каменная кветачка, накшталт стылізаванага эдэльвейса, які сімвалізуе прыгажосць жыцця і непакорнасць перад выпрабаваннямі.

Пры знаёмстве з субяседнікамі даведалася пра тое, што гэты помнік воінам-інтэрнацыяналістам не першы для Уладзіміра Іванавіча. Адразу пасля службы ў арміі ў 1981 годзе помнік афганскай тэматыкі ўстанавіў у Віцебску. Ён прысвячаўся першаму Герою Афганістана,

старшаму сяржанту Мiраненку. Потым двухфрагментны комплекс з'явiўся ў Светлагорску. Цяпер вось i мы з удзячнасцю будзем успамiнаць скульптара Жбанава.

Увогуле, гэта цiкавы, негледзячы на сваю маладосць, вядомы чалавек. Яго работы – удалае дапаўненне Мiхайлаўскага скверу ў Мiнску. Тут тры паркавыя скульптуры Уладзiмiра Iванавiча: «Дама на лаўцы», «Прыкурваючы» i «Дзяўчынка з парасонiкам». Цяпер творца рыхтуецца да конкурсу па стварэнню скульптурнай часткi фантана на Цэнтральнай плошчы Мiнска. А мы з вамi, шаноўныя, будзем з нецярплiвасцю чакаць моманту адкрыцця помнiка ў нашым горадзе. Урачыстасць з гэтай нагоды мяркуецца адбыцца ў сярэдзiне верасня. Пакуль жа тут вядуцца работы па добраўпарадкаванню пляцоўкi. На iх заняты работнiкi ПМК-49.

**А. Капшуль**